УДК 796.032(091)

***Уладзімер Паўлавіч Люкевіч***
*канд. філас. навук, дац., дац. каф. спартыўных дысцыплін і методык іх выкладання*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Uladzimier Lukievic***
*Candidate of Philosophical Sciences, Associate Professor,*
*Associate Professor of the Department of Sports Disciplines and Methods of their Teaching*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: lucul@brsu.brest.by

# П'ЕР ДЭ КУБЕРТЭН: АДРАДЖЭННЕ І ЗАНЯПАД АЛІМПІЙСКАЙ ІДЭІ

*Сацыяльна-філасофская праблематыка ў спорце ў цяперашні час выклікае павялічаную зацікаўленасць у грамадстве ў сувязі з імклівым распаўсюджваннем глабалізацыйных працэсаў, якія ахапілі ўвесь свет. Перш за ўсё гэта адносіцца да сістэмы міжнародных топ-спаборніцтваў, такіх як Алімпійскія гульні, чэмпіянаты свету і Еўропы па футболе і інш. Змест падобнага роду турніраў базіруецца на паняцці алімпізму, сутнасцю якога з'яўляецца алімпійская ідэя, што бярэ свой пачатак у філасофіі Старажытнай Грэцыі. Сваё сучаснае ўвасабленне яна набыла дзякуючы актыўнай дзейнасці мыслення П'ера дэ Кубертэна, які па праву лічыцца заснавальнікам алімпійскага руху нашага часу.*
***Ключавыя словы:*** *П'ер дэ Кубертэн, культура, філасофія, спорт, алімпізм, гісторыя, міжнародныя гульні.*

## *Pierre de Coubertin: Renaissance and Decline of the Olympic Idea*

*Socio-philosophical problems in sports are currently attracting increased interest in society due to the rapid spread of globalization processes that have covered the whole world. First of all, it refers to the system of international top competitions, such as the Olympic Games, World and European football championships, etc. The content of this type of tournament is based on the concept of Olympism, the essence of which is the Olympic idea, which originates in the philosophy of Ancient Greece. It acquired its modern incarnation thanks to the active thinking of Pierre de Coubertin, who is rightfully considered the founder of the Olympic movement of our time.*
***Key words:*** *Pierre de Coubertin, culture, philosophy, sport, Olympism, history, international games.*

## Уводзіны

Імя французскага спартыўнага і грамадскага дзеяча, філосафа і педагога, заснавальніка сучаснага алімпійскага руху барона П'ера дэ Кубертэна (Pierre de Coubertin) шырока вядомае ва ўсім свеце. Менавіта ён у 1887 г. ініцыяваў стварэнне Саюза французскіх таварystваў бегу, пазней Саюза французскіх таварыстваў атлетычных відаў спорту, і Камітэта па прапагандзе фізічнага выхавання. Яго рэфарматарскія погляды на сістэму адукацыі знайшлі ўвасабленне ў дзвюх кнігах: «Выхаванне ў Англіі» (L'Éducation en Angleterre. Paris: Hachette, 1888) і «Англійскае выхаванне ў Францыі» (L'Éducation anglaise en France. Paris: Hachette, 1889).

Але сусветная яго слава звязана менавіта з алімпізмам. П'ер дэ Кубертэн вызначыўся нязвыклым арганізатарскім талентам у справе адраджэння старажытных Алімпійскіх гульняў. Ён змог прыцягнуць на свой бок шмат якіх еўрапейскіх палітыкаў і грамадскіх дзеячаў, набыў прыхільнікаў і паслядоўнікаў у розных краінах. Таму, калі 16–23 чэрвеня 1894 г. у парыжскай Сарбоне на знакамітым Міжнародным атлетычным кангрэсе было прынятае гістарычнае рашэнне пра адраджэнне Алімпійскіх гульняў, роля Кубертэна ў гэтым працэсе была вызначальнай і вырашальнай. З 1896 па 1925 г. ён узначальваў Міжнародны алімпійскі камітэт, і такім чынам застаўся другім пасля Дэметрыюса Вікеласа (Demetrius Vikelas) прэзідэнтам МАК.

П'ер дэ Фрэдзі, барон дэ Кубертэн, нарадзіўся 1 студзеня 1863 г. у Парыжы ў арыстакратычнай сям'і з багатымі гістарычнымі традыцыямі. Гэта было чацвёртае дзіця барона Шарля Луі Фрэдзі, барона дэ Кубертэна (Charles Louis Frédy, Baron de Coubertin) і Мары-Марсель Жыго дэ Крысенуа (Marie-Marcelle Gigault de Crisenoy). Базавую адукацыю атрымаў у езуіцкім калегіуме пад назвай Externat de la rue de Vienne, куды ў кастрычніку 1874 г. быў запісаны

сваімі бацькамі. Шмат хто з тагачасных наведвальнікаў прыходзіў туды толькі на дзённыя заняткі, у той час як Кубертэн жыў там пад наглядам святара-езуіта, які павінен быў даць яму ўзорны ўзровень маральнай і рэлігійнай адукацыі. Потым у 1880–1885 гг. ён вучыўся ў Школе палітычных навук, а таксама яшчэ спрабаваў свае сілы ў вывучэнні права, якое, праўда, кінуў праз год, і ў вайсковай школе ў Сен-Сір (Saint-Cyr), але практычна адразу пакінуў яе. Кубертэн не працягнуў сямейнай палітычнай традыцыі і шукаў іншыя спосабы ўключыцца ў грамадскае жыццё краіны. Трэба заўважыць, што, як прадстаўнік вышэйшых колаў грамадства, Кубертэн мог выбраць для сябе кар'еру вайскоўца ці палітыка. Але ён схіліўся да дзейнасці ў інтэлектуальным накірунку, а больш дакладна, яго цікавілі філасофія, адукацыя, гісторыя, літаратура і сацыялогія.

Напачатку сваёй дарослай кар'еры ён быў настолькі багаты, што яму не прыйшлося ўладкоўвацца на сталую працу: яго маёмасць ацэньвалася прыкладна ў 500 тысяч франкаў золатам. У 1895 г. ён ажаніўся з Мары Ратан (Marie Rothan), з якой у яго было двое дзяцей, але шлюб стаўся не вельмі ўдалым. Старэйшы сын Жак (Jacques Frédy de Coubertin) і малодшая дачка Рэні (Renée Frédy de Coubertin) былі схільны да псіхічных захворванняў. А Мары Ратан перажыла свайго мужа і дзяцей і памерла ва ўзросце 101 года.

***Мэта работы*** заключаецца ў філасофскай рэфлексіі і пераасэнсаванні канцэпцыі алімпійскай ідэі П'ера дэ Кубертэна. Алімпізм як філасофія жыцця ўзнік напачатку XX ст., перажыў перыяд свайго росквіту, але ў 20-я гг. XXI ст. выявіў прыкметы свайго крызіснага стану. Алімпійская ідэя П'ера дэ Кубертэна, сфарміраваная на аснове яго рамантычных і сентыменталістычных поглядаў на ролю спорту ў сучасную эпоху, увайшла ў супярэчнасці з рэаліямі цяперашняга часу.

***Метады даследавання.*** Напісанне артыкула і ў сувязі з гэтым падбор матэрыялаў для гэтай публікацыі патрабавалі для выкарыстання шэраг такіх метадаў даследавання, як назіранне на падставе суб'ектыўнай перцэпцыі, апісанне, параўнанне, аналіз навуковых, публіцыстычных і дакументальных крыніц, вывучэнне адкрытай у доступе інтэрнэт-інфармацыі. Філасофія алімпізму ў кубертэнаўскім яе ўяўленні патрабуе адпаведнай інтэрпрэтацыі, а таксама экстрапаляцыі яе прынцыпаў як на шырокія колы публічнасці, так і на цэлы спектр сацыякультурных феноменаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне**

Нягледзячы на шырокую сферу зацікаўленасцяў П'ера дэ Кубертэна, адным з найбольш прывабных для яго прадметаў была філасофія адукацыі, і ў прыватнасці фізічнае выхаванне і спорт у школьным навучанні. Пасля наведвання ім у 1883 г. Англіі і знаёмства з праграмай, якую распрацаваў Томас Арнольд (Thomas Arnold), Кубертэн рабіў вялікія намаганні, каб адаптаваць убачанае ў Францыі, бо імкнуўся перавыхаваць нацыю, каб вярнуць ёй пачуццё годнасці, і лічыў, што ўвядзенне сістэмы школьнага і студэнцкага спорту, якая эфектыўна працуе у Брытаніі, умацуе французскае грамадства, а таксама падрыхтуе будучых абаронцаў краіны. Урэшце рэшт удалося дамагчыся таго, што школьныя спартыўныя спаборніцтвы пачалі адбывацца ў Парыжы.

Далей актыўная дзейнасць Кубертэна прывяла да стварэння ў 1888 г. Камісіі садзейнічання фізічнаму выхаванню. У той час ён яшчэ таксама быў галоўным рэдактарам часопіса «Revue Athlétique», дзе прапагандаваў свае ідэі. Напачатку 1890-х гг. французскі ўрад даручыў яму правесці даследаванне гісторыі сусветнага спорту, што дапамагло ўсталяваць шматлікія міжнародныя кантакты і разглядаць спорт у якасці носьбіта міру і спакою [1].

Сістэма фізічнага выхавання і арганізаваны школьны спорт у Англіі разам з сабраным матэрыялам па гісторыі сусветнага спорту ў сацыякультурнай прасторы паступова прывялі да меркаванняў пра яго выключную ролю ў чалавечым грамадстве. П'ер дэ Кубертэн быў упэўнены, што спорт вядзе да духоўнага і інтэлектуальнага развіцця, вучыць дысцыпліне і забяспечвае гармонію духу і цела, якое становіцца прыгожым праз фізічныя практыкаванні. Ён таксама лічыў, што ў спорце няма месца хлусні і падману і сам атлет павінен быць высакароднай асобай і змагацца сумленна. Яго ідэя міру грунтавалася на падставе думкі пра тое, што маладыя людзі, якія прымаюць удзел у спаборніцтвах, знаёмяцца паміж сабой, адкрываюць для сябе новыя

культуры, што дапамагае зняць узровень узаемнай напружанасці і варожасці. Спорт, арганізаваны ў фармаце гульняў, на яго думку, выступае маральнай і сацыяльнай сілай, якая ўвасаблялася ў гарманічнай раўнавазе душы і цела. Такі падыход грунтаваўся на падставе старажытнагрэчаскай традыцыі: неабходна было толькі ўзнавіць яе ў сучасных сацыяльна-эканамічных рэаліях. Ідэалізаванае ўспрыманне гульняў з далёкага мінулага падштурхнула яго да аднаўлення падобнай сістэмы спаборніцтваў на міжнародным узроўні, тым больш што гэта было важна з пункту гледжання практычных меркаванняў. Калі не браць пад увагу пытанне фізічнай загартоўкі, якое з'яўляецца аднолькава важным для чалавечай дзейнасці ў розных яе галінах, то дэмакратычныя вартасці спорту паўставалі як дастаткова сур'ёзны аргумент распаўсюджвання яго ў грамадстве. У выніку не зусім удалыя спробы Кубертэна ўключыць фізічную адукацыю ў французскія школы прымусілі яго сканцэнтравацца на распрацоўцы ідэі адраджэння алімпізму ў фармаце міжнародных гульняў.

Нельга адназначна сцвярджаць, што намаганні аднавіць Алімпійскія гульні не прымаліся раней. Дастаткова назваць імёны доктара Вільяма Пэні Брукса (William Penny Brookes) з Вялікабрытаніі, а таксама Іааніса Факіянаса (Ioannis Phokianos) з Грэцыі. Апошні, дарэчы, дзякуючы вялікай фінансавай дапамозе стрыечных братоўфілантропаў Эвангеласа і Канстанцінаса Запасаў (Evangelos Zappas, Konstantinos Zappas) паспяхова праводзіў спаборніцтвы на тэрыторыі Грэцыі. П'ер дэ Кубертэн не толькі ведаў пра іх дзейнасць, але на пэўным этапе падрыхтоўкі да кангрэса 1894 г. супрацоўнічаў з імі. Праўда, гульні, якія праводзіліся раней, насілі лакальны характар.

Падрыхтоўка да кангрэса 1894 г. інспіравала філасофскае асэнсаванне алімпійскай ідэі. Адным з галоўных пытанняў заставалася канцэптуальнае ўвасабленне зместу спаборніцтваў паміж спартоўцамі-аматарамі. Сам П'ер дэ Кубертэн публічна не пагаджаўся з тым, што, напрыклад, са спаборніцтваў па веславанні выключаліся прадстаўнікі рабочага класа. Ён знаходзіўся на перакрыжаванні думак пра тое, што, з аднаго боку, спартоўцам не належала б плаціць за тое, што яны ўдзельнічаюць у спаборніцтвах, а з другога – яны мелі права на кампенсацыю за страчаны прафесійны заробак. Тым не менш ён заставаўся непахісным прыхільнікам аматарства ў сістэме алімпійскага руху.

Калі Кубертэн публічна неаднаразова выказваўся за адраджэнне Алімпійскіх гульняў, то яго прапанова, як правіла, выклікала ўсеагульную эмацыйную падтрымку зацікаўленых асоб, аднак, на жаль, далей справа не мела працягу. Гэта змусіла змяніць стратэгію і паспрабаваць зноў падняць пытанне падчас знакамітага кангрэса 1894 г. Там у працэсе працы ў дзвюх камісіях актыўна абмяркоўваліся праблемы аматарства і алімпізму. Калі абстрагавацца ад дэбатаў па першым накірунку, то другі застаўся ў гісторыі сучаснага спорту як вызначальны пункт у арганізацыі міжнародных гульняў па старажытнагрэчаскім узоры. Дзякуючы бліскучаму выступленню па гэтай тэматыцы Дэметрыуса Вікеласа было прынята рашэнне аб аднаўленні Алімпіядаў.

Трэба заўважыць, што ў перыяд падрыхтоўкі першай Алімпіяды сучаснасці, якая адбылася ў Афінах, што сімвалізавала сувязь са старажытнымі гульнямі, сам дэ Кубертэн застаўся як бы на другім плане. Гэта, як заўважаюць даследчыкі гісторыі алімпізму прафесар Дэвід Янг (David Young) і гісторык Джон Лукас (John Lucas), было звязана з яго сямейнымі праблемамі. Галоўная роля ў арганізацыі належала абранаму на кангрэсе прэзідэнту створанага Міжнароднага алімпійскага камітэта Дэметрыусу Вікеласу [2].

Калі сканцэнтравацца на ідэі алімпізму ў кубертэнаўскім успрыманні, то яна базіравалася на суб'ектыўнай інтэрпрэтацыі старажытнагрэчаскай культуры з яе спаборніцтвамі незаангажаваных атлетаў на аснове сумленнага высакароднага змагання. Святы мір у гэтым выпадку як мага лепш характарызаваў сутнасць гульняў, а экстрапаляцыя такога ўспрымання на сучасную гісторыю дадавала яшчэ большую прывабнасць адраджэнню. Роля Алімпійскіх гульняў сучаснасці, на думку П'ера дэ Кубертэна, павінна была садзейнічаць узаемаразуменню паміж культурамі, што рабіла б меншай рызыку ўзнікнення вайны. Філасофскае асэнсаванне спаборніцтваў выявілася ў яго падыходзе да сутнасці спаборніцтваў: барацьба за перадоленне саперніка з'яўляецца больш важ-

най за перамогу, альбо, як ён сам выказаўся на гэты конт, галоўнае ў жыцці не трыумф, а барацьба; галоўнае не ў тым, каб атрымаць перамогу, а добра біцца [2].

Алімпіяды сучаснасці, зразумела, маюць шмат адметнасцяў у параўнанні з тымі спаборніцтвамі, якія праходзілі напрыканцы XIX ст. Яны адрозніваюцца не толькі па форме правядзення, але і па тым змесце, што складае іх унутраную сутнасць. Паняцце адной з самых старажытных глабальных ідэй чалавецтва – ідэі алімпізму – у XIX ст. пэўным чынам трансфарміравалася, а ў нашы дні перажывае адпаведную мадэрнізацыю. Можна дыскусіраваць адносна праблемы развіцця алімпізму адразу ў некалькіх накірунках, у тым ліку і наконт яго крызісу, але таксама немалаважна прасачыць некаторыя суадносіны пераўвасаблення алімпійскай ідэі ад часоў кубертэнаўскага рэнесансу да сённяшніх рэалій.

Алімпійская ідэя, якая фарміравалася на тэрыторыі Старажытнай Грэцыі, у самым агульным выглядзе можа характарызавацца як утварэнне з трох элементаў: ідэі аб гарманічным развіцці чалавечай асобы, ідэі свяшчэннага міру, ідэя fair play. У паэтызаванай форме дэ Кубертэн выказаўся пра гэта, за што і атрымаў залаты медаль на літаратурным конкурсе на V летніх Алімпійскіх гульнях 1912 г. у Стакгольме за паэму «Ода спорту», якую прадставіў журы ад імя француза Жоржа Арода і немца Марціна Эшбаха (Georges Hohrod and Martin Eschbach), прычым сапраўднае імя аўтара высветлілася толькі падчас цырымоніі ўзнагароджання. Выбар імёнаў аўтараў твора ўтойваў у сабе сімвалічнае значэнне – узаемапаразуменне паміж народамі.

Па-першае, П'ер дэ Кубертэн падкрэсліў імкненне да гармоніі ў спалучэнні ў чалавеку фізічных і духоўных якасцяў:

«О спорт! Ты – зодчий!

Ты помогаешь находить пропорции совершеннейшего творения
природы – человека, торжествующего в победе и сокрушающегося в неудаче.

Ты – мастер гармонии.

Ты делаешь нас сильными, ловкими, статными, исправляешь недостатки, унаследованные нами от рождения.

Ты особенный, необычный зодчий. Твой строительный материал – человек в движении.

Ты доказал, что вечное движение – не мечта, не утопия. Оно существует.

Вечное движение – это спорт» [Цыт. па: 3, с. 179–180].

У больш шырокай інтэрпрэтацыі алімпійская ідэя, як яе сабе ўяўляў П'ер дэ Кубертэн, увасабляла развіццё міжнароднага спартыўнага руху на аснове гуманістычных традыцый, пераадоленне разнастайных сацыяльных супярэчнасцяў, фарміраванне ўнутранай эстэтычнай і этычнай сутнасці спорту, развіццё таварыскіх спартыўных кантактаў паміж народамі, аматарства ў спорце, а таксама спалучэнне міжнароднага спартыўнага руху з прагрэсіўнымі сіламі чалавецтва. Такі падыход у пэўным сэнсе базіраваўся на прынцыпах спартыўнай этыкі, і сам спорт вызначаўся не толькі як сродак фізічнага развіцця чалавечага цела, але і як метад выхавання сучаснага чалавека ў духу скіраванасці да мірнага ўзаемадзеяння.

Прафесар Юзэф Ліпец (Józef Lipiec) у сваёй кнізе «Філасофія алімпізму» адносна паняцця «алімпійская ідэя» падкрэслівае, што напісана пра яе настолькі шмат, што кожная новая спроба нейкага іншага яе прачытання з непазбежнасцю вядзе да банальнага паўтарэння. Існуе, аднак, магчымасць дыялектычнага суаднясення ў гістарычным успрыманні па меншай меры дзвюх пар узаемазвязаных велічынь. Першую ўтвараюць класічны старажытнагрэчаскі алімпізм, насычаны духам рэлігійнай і філасофскай калакагатыі, і сінкрэтычны і касмапалітычны алімпізм, характэрны для эпохі элінізму і рымскага імперыялізму. Другая пара складаецца з рамантычнага і аматарскага алімпізму эпохі Кубертэна і прагматычнага, прафесійнага, гіганцкага, камерцыйнага, медыяльнага, узброенага сродкамі аўтаномнай універсальнасці алімпізму эры Самаранча [4, с. 129]. Ю. Ліпец вельмі ўдала падкрэсліў сутнасць разумення алімпійскай ідэі праз П. дэ Кубертэна на аснове рамантызму і аматарства [4, с. 128–131], што дазваляла падвесці гэты феномен пад акрэсленне яго з боку эстэтычных і этычных складнікаў, такіх, напрыклад, як прыгажосць, справядлівасць, высакародства і інш.

Па-другое, паняцце алімпійскай ідэі непарыўна звязана з яшчэ адным старажытнагрэчаскім вынаходніцтвам – свяшчэнным мірам. За чатыры тыдні да пачатку Алімпійскіх гульняў, на час іх правядзення

і на чатыры тыдні па заканчэнні Алімпіяд павінны былі спыніцца ўсе войны на тэрыторыі Элады. Гэта палажэнне таксама знайшло свой адбітак у кубертэнаўскім падыходзе:

«О спорт! Ты – мир!

Ты устанавливаешь хорошие, добрые, дружественные отношения между народами.

Ты – согласие.

Ты сближаешь людей, жаждущих единства.

Ты учишь разноязыкую, разноплеменную молодежь уважать друг друга.

Ты – источник благородного, мирного, дружеского соревнования.

Ты собираешь молодость – наше будущее, нашу надежду – под свои мирные знамена.

О спорт!

Ты – мир!» [Цыт. па: 3, с. 182].

Чалавецтва ад пачатку свайго існавання заўсёды пакутавала ад войнаў. Спорт у сучасную эпоху стаў выконваць кампенсаваную функцыю, якая павінна спрыяць перанясенню вырашэнняў сацыяльных канфліктаў у іншую сферу. Спробы спыніць войны з дапамогай спорту рабіліся неаднойчы. Так, напярэдадні зімовых Алімпійскіх гульняў 1984 г. у Сараеве тагачасны прэзідэнт МАК маркіз Хуан Антоніа Самаранч заклікаў спыніць усе баявыя дзеянні на час правядзення Гульняў. На жаль, заклікі не заўсёды прымаліся да ведама.

Па-трэцяе, пільную ўвагу трэба звярнуць на яшчэ адзін элемент спадчыны старажытнагрэчаскай даўнасці, а менавіта arete. Гэты тэрмін, які ў самым агульным сэнсе можа быць трактаваны як адвага, гонар, мужнасць, мае самыя непасрэдныя адносіны да сфарміраваных да сённяшняга дня прынцыпаў fair play [5, с. 128–131]. Менавіта так можа разглядацца першасны падыход да ўтварэння сучаснага разумення сумленнага і высакароднага змагання. Далей ён увасабляецца ў тым, што паўстае формула шляхетных паводзін (у тым ліку і на спаборніцтвах), у фарміраванні якой вялікае значэнне належала ўплыву культуры хрысціянскага Сярэднявечча, асабліва рыцарскай культуры з яе духам чыстага, без падману, з роўнасцю шанцаў адзінаборства. Нарэшце, згодна з трэцім падыходам, мяркуецца, што прынцыпы fair play спачатку ўзнікаюць у спорце, а потым ужо пачынаюць распаўсюджвацца на іншыя сферы жыцця [6, с. 63–67].

П’ер дэ Кубертэн з уласцівым яму імпэтам вызначае наступным чынам гэты аспект алімпійскай ідэі:

«О спорт! Ты – благородство!

Ты осеняешь лаврами лишь того, кто боролся за победу честно, открыто, бескорыстно.

Ты – безупречен.

Ты требуешь высокой нравственности, справедливости, моральной чистоты, неподкупности.

Ты провозглашаешь: если кто-нибудь достигнет цели, введя в заблуждение своих товарищей, достигнет славы при помощи низких, бесчестных приемов, подавив в себе чувство стыда, тот заслуживает позорного эпитета, который станет неразлучен с его именем.

Ты возводишь стадионы – театры без занавесей. Все свидетели всему.

Никакой закулисной борьбы.

Ты начертал на своих скрижалях: “Трижды сладостна победа, одержанная в честной благородной борьбе”» [Цыт. па: 3, с. 180–181].

Пазней, у 90-я гг. ХХ ст., быў распрацаваны шэраг дакументаў, якія ўдакладнялі і канкрэтызавалі базавыя палажэнні маральных аспектаў спорту. Адной з такіх крыніц з’яўляецца Спартыўны этычны кодэкс «fair play – шлях да перамогі». У ім найперш утрымліваюцца палажэнні, накіраваныя ў бок дзяцей і моладзі, а таксама маюць дачыненні да тых сацыяльных інстытутаў і фізічных асоб, што працуюць з вызначанай сацыяльнай групай [7, с. 77–83].

Глыбіня кубертэнаўскай думкі ў распрацоўцы алімпійскай ідэі дасягала інтэрпрэтацыі сутнасці паняцця спартыўнай дзейнасці, якая прызнавалася выключна як непрафесійная, і таму найважнейшым вынікам яе было атрыманне самім атлетам пачуцця задавальнення, перш за ўсё маральнага і эстэтычнага. Згодна з такім падыходам П. дэ Кубертэн адмоўна ставіўся да баксёрскіх двубояў за грошы, размяжоўваў працу настаўніка фізічнага выхавання і прафесійнага выкладчыка – першы павінен быць аматарам, а таксама быў супраць усялякіх публічных спаборніцтваў для юніёраў ва ўзросце да 16 гадоў [8, с. 132]. Таму няма ніякай нечаканасці ў тым, як заснавальнік

сучасных Алімпіяд трактаваў адносіны спартсмена да гэтага віду дзейнасці: галоўнае не перамога, а ўдзел. Хоць, з іншага боку, з гістарычных крыніц вядома, што ў Старажытнай Грэцыі падчас правядзення Алімпійскіх, Нямейскіх, Піфійскіх, Істмійскіх і іншых гульняў існавалі грашовыя ўзнагароды для пераможцаў – ад 500 драхмаў на Алімпійскіх гульнях да 100 драхмаў на Істмійскіх [9, с. 3–7].

Праз некаторы час уяўленне пра сутнасць спорту пачне паступова мяняцца. Пад уплывам дамініканіна Анры Дзідона (Henri Didon), дырэктара адной са школ у прыгарадзе Парыжа, нарадзіўся славуты дэвіз «Citius. Altius. Fortius» (Хутчэй. Вышэй. Мацней). А ўрэшце і сам П. дэ Кубертэн практычна паказвае шлях да прафесіяналізацыі спорту. У адным са сваіх тэкстаў, які пазней быў перакладзены на розныя мовы, ён сфармуляваў закон, які выглядае наступным чынам: на сто асоб, якія прысвячаюць сябе фізічнай культуры, пяцьдзясят павінна займацца спортам; каб гэтыя пяцьдзясят займаліся спортам, дваццаць павінны ў ім спецыялізавацца; каб дваццаць спецыялізавалася, пяцёра павінны быць здольнымі ў дасягненні дзівосных вынікаў [8, с. 134]. Прайшло зусім крыху часу, і пяцёра здольных у дасягненні дзівосных вынікаўператварыліся ў прафесіяналаў. Рамантычная і поўная сантыментаў эра П'ера дэ Кубертэна практычна завяршылася.

Кубертэна таксама неаднаразова падвяргалі крытыцы за яго асабістую трактоўку Алімпійскіх гульняў, іх празмерную рамантызацыю і прафесіяналізацыю. Яго сцвярджэнне, што Алімпіяды дапамагаюць захаваць мір, таксама сустракалася скептычна. Акрамя таго, лічылі, што ён перабольшваў сваю ролю ў вырашэнни рознага роду алімпійскіх пытанняў. У віну Кубертэну ставілася і тое, што ён актыўна супрацоўнічаў з гітлераўскім рэжымам падчас Берлінскай Алімпіяды 1936 г., а таксама меў намер перадаць правы на свае кнігі Трэцяму рэйху. Акрамя таго, зрабіў яскравую прамову на радыё, дзе гаварыў пра Адольфа Гітлера як пра аднаго з лепшых творчых духаў сваёй эпохі. А калі выступаў на закрыцці Алімпіяды 1936 г., то выказаў падтрымку нацысцкаму рэжыму. Ён жа заснаваў у Германіі Алімпійскі інстытут і падтрымаў ідэю менавіта тут праводзіць Алімпійскія гульні [1].

Агульная сітуацыя, якая паўстала напачатку адраджэння, станаўлення і развіцця Алімпійскага руху, патрабавала, аднак, не толькі інтэлектуальных намаганняў, але і фінансавых сродкаў. Асабістыя матэрыяльныя страты ў сувязі з папулярызацыяй алімпійскай ідэі, а таксама біржавыя непрыемнасці пазбавілі П'ера дэ Кубертэна зберажэнняў і прымусілі яго ва ўзросце больш як за 70 гадоў шукаць сродкі для існавання. Гэта паўплывала на тое, што Кубертэн пакінуў дзейнасць у МАК. Яго сябар доктар Франсіс Месерлі (Francis Mes-serli), сакратар Алімпійскага камітэта Швейцарыі, спрабаваў неяк дапамагчы. Дзякуючы яго намаганням, у 1936 г. Кубертэн стаў кандыдатам на Нобелеўскую прэмію міру, якую, аднак, не атрымаў. Пасля гэтага Месерлі заснаваў Фонд П'ера дэ Кубертэна і звярнуўся да алімпійскіх камітэтаў усяго свету з просьбай ахвяраваць грошы. Сабраныя сродкі павінны былі быць перададзены ў распараджэнне Кубертэна з нагоды 50-годдзя яго дзейнасці па рэформе адукацыі. Больш за ўсё грошай, 10 тыс. марак, ахвяраваў Алімпійскі камітэт Германіі. Уся сабраная сума склала 50 тыс. швейцарскіх франкаў, якія барон перадаў у распараджэнне сваёй сям'і, каб забяспечыць ёй годныя ўмовы жыцця [1].

Асабістае ўспрыманне таго, што ўяўляе сабой алімпійская ідэя, неяк разыходзіцца з шэрагам эпізодаў уласнага жыцця П'ера дэ Кубертэна, асабліва тое, што датычыцца яго стасункаў з уладамі фашысцкай Германіі. На гэта звяртае ўвагу, напрыклад, Джордж Хіртлер (George Hirthler). У 1930 г. было прынята рашэнне аб правядзенні XI летніх Алімпійскіх гульняў у Берліне. Як прадстаўнікі гаспадароў будучых спаборніцтваў, шмат намаганняў для рэалізацыі гэтага зрабілі Карл Дзім (Carl Diem) і Тэадор Левальд (Theodor Lewald), якія блізка супрацоўнічалі з Кубертэнам. Аднак калі ў 1933 г. да ўлады ў Германіі прыйшлі нацысты, шмат якія краіны планавалі байкатаваць Гульні. Нечакана П'ер дэ Кубертэн заклікаў не рабіць гэтага. Безумоўна, ён застаецца ў гісторыі алімпійскага руху як заснавальнік сучасных міжнародных спартыўных гульняў, але яго маральны выбар прымушае звярнуць увагу і на гэты вядомы факт яго

жыцця. Зразумела, што ён быў адным з першых, хто ўбачыў крэатыўныя магчымасці спорту ў сацыяльных і адукацыйных мэтах, у справе ўмацавання міру на ўсім свеце, але сацыяльная рэальнасць у гэтым выпадку была мацнейшая за духоўныя прынцыпы [10].

Філасофскія падставы алімпізму ва ўспрыманні Кубертэна абмяркоўваюцца да цяперашняга часу. Так, напрыклад, Дэвід Янг лічыць, што Кубертэн залішне ідэалізаваў старажытныя гульні, калі лічыў, што ўдзельнікі былі аматарамі. Але ёсць сведчанні, што атлеты спецыяльна рыхтаваліся да спаборніцтваў і нават атрымлівалі матэрыяльныя ўзнагароды [9, с. 3–7]. Таксама Янг раскрывае даволі цікавую думку адносна кіраўніцтва і кантролю над міжнароднымі спартыўнымі спаборніцтвамі [2]. Як вядома, П’ер дэ Кубертэн адносіўся да вышэйшых сацыяльных колаў грамадства і меў тытул барона. Адназначна нельга сцвярджаць, але гаворка можа ісці пра тое, каб даць вышэйшым класам большы кантроль над спартыўнымі спаборніцтвамі і, такім чынам, пазбавіць такой магчымасці прадстаўнікоў іншых сацыяльных колаў. Свядома рабілася гэта ці не, зараз вызначыць немагчыма. Дарэчы, калі прасачыць за тым, хто займаў і займае пасады вышэйшага кіраўніцтва МАК, то меркаванні падобнага роду не страцілі сваёй актуальнасці да цяперашняга часу.

Не будзе лішнім заўважыць, што Алімпійскія гульні маюць выключна еўрапейскае паходжанне. Гэта ідэя дасягае калыскі Еўропы, элінскай культуры, і гэтая еўрапейскасць тэрытарыяльна абмежаваная яе заходняй часткай. Ідэя глабальных гульняў мела шанцы на поспех, таму што яна дасягнула розных куткоў зямлі разам з еўрапейскай культурай, носьбітамі якой былі англійскія і французскія каланізатары. Да сярэдзіны XIX ст. існавала адна вялікая англійская каланіяльная дзяржава. Затым адразу за Вялікабрытаніяй у барацьбу за новыя сферы ўплыву ўключыліся іншыя краіны Старога кантынента. Неўзабаве ўся Афрыка, за выключэннем Ліберыі і Эфіопіі, засталася пад кантролем, а Азія з цяжкасцю супраціўлялася каланізацыі. Еўропа дамінавала над астатнім светам, і яе патэнцыял рухаў развіццё цывілізацыі. У барацьбе за культурнае сусветнае першынство лідзіравалі Англія і Францыя, і спорт быў неад’емнай часткай іх татальнай перавагі [11, с. 44].

Ва ўмовах крызісу адукацыйных каштоўнасцяў ідэя алімпізму разам з прынцыпам сумленнай гульні многімі прыхільнікамі ўспрымаецца як адна з найбольш эфектыўных форм выхавання, якая павінна заняць вядучае месца ў сучаснай філасофскай думцы. Алімпізм прадстаўляе гуманістычныя каштоўнасці, ён стаў падставай для фізічнай культуры і спорту, надаў ім высокі сацыяльны статус. Гэта ідэя спарадзіла канцэпцыю алімпійскай адукацыі, якая рэалізуецца ў двух напрамках – па-першае, як падрыхтоўка да Алімпійскіх гульняў, па-другое, як элемент адукацыі і выхавання, што праяўляецца ў рэалізацыі шматлікіх праектаў, якія прапагандуюць змест і ідэалы агульначалавечых і гуманістычных каштоўнасцяў, перадача якіх у навучальныя сістэмы стварае магчымасць для трывалай сувязі паміж фізічнай культурай і сучаснай сістэмай адукацыі.

Ідэя алімпізму як гуманістычнай каштоўнасці сучаснай сусветнай алімпійскай думкі ў сілу свайго шматвяковага паходжання зведала нямала метамарфоз і змяніла свае культураўтваральныя і сацыяльныя функцыі ад пачатку Гульняў Старажытнай Грэцыі і праз кубертэнаўскі гуманістычны неаалімпізм да сучаснага ўніверсальнага і глабальнага алімпізму. Алімпійскі рух прадугледжваў пабудову лепшага свету, які выключае расавую, палітычную і сацыяльную дыскрымінацыю. Алімпізм стварыў гуманістычны светапогляд і стаў асновай фізічнай культуры і спорту, надаў ім высокі сацыяльны ранг. Негледзячы на шматлікія ўзрушэнні і пагрозы палітычнай сцэны падзеленага свету, кожныя чатыры гады працягваецца свята спорту і сяброўства моладзі ўсіх народаў у форме Алімпійскіх гульняў. Безумоўна, такое становішча звязана з няўхільным выкананнем алімпійскай канстытуцыі – Алімпійскай хартыі [12], якая вызначае асноўныя задачы алімпійскага руху.

Алімпізм – гэта філасофія жыцця, якая ўсхваляе і злучае ў збалансаванае цэлае якасць цела і волю розуму. Праз спалучэнне спорту з культурай і адукацыяй алімпізм імкнецца стварыць такі лад жыцця, які заснаваны на радасці намаганняў, адукацыйных каштоўнасцях добрага прыкладу і павазе да ўніверсальных асноўных этычных

прынцыпаў. Мэта алімпізму заключаецца ў тым, каб спорт служыў гарманічнаму развіццю чалавека з бачаннем развіцця міралюбівага грамадства і павагі да чалавечай годнасці. Занятак спортам – права чалавека. Кожны павінен мець магчымасць займацца спортам без якой-небудзь дыскрымінацыі і ў алімпійскім духу, які патрабуе ўзаемаразумення на аснове сяброўства, салідарнасці і сумленнай гульні. Любая форма дыскрымінацыі ў дачыненні да краіны або асобы па прыкмеце расы, рэлігіі, палітычных перакананняў, полу або любой іншай прыкмеце несумяшчальная з прыналежнасцю да алімпійскага руху. У дыскусіі і развагах аб алімпійскай адукацыі галоўным яе зместам з'яўляецца ідэя алімпізму разам з прынцыпам сумленнай гульні, а непасрэдным сродкам дыдактычнага і выхаваўчага ўздзеяння з'яўляецца спорт.

Гульні адноўленай Алімпіяды першапачаткова былі змаганнямі спартсменаўаматараў без спонсарскай падтрымкі дзяржавы ці буйной транснацыянальнай карпарацыі. Гэта былі сапраўды гульні спорту і здаровага спаборніцтва, дзе ў моладзі развіваўся дух спартыўнай барацьбы. З часам спартыўныя спаборніцтвы сталі арэнай саперніцтва паміж краінамі і буйнымі міжнароднымі карпарацыямі і, больш за тое, сталі падвяргацца палітычнаму ўплыву [13, с. 3].

**Заключэнне**

Алімпізм сучаснай эпохі, адроджаны баронам П. дэ Кубертэнам, з самага пачатку свайго існавання павінен быў змагацца з шэрагам перашкод. Будучы ў задуме творцы сяброўскім рухам, ён быў апафеозам міру і індывідуальнага самаўдасканалення. У выніку за першыя сорак гадоў свайго існавання ён стаў гратэскам і месцам развіцця прыватных, часта палітычных, інтарэсаў. Відавочна, што, акрамя падобнай назвы і асобных сімвалаў, сучасны алімпізм мае мала агульнага са сваім грэчаскім прататыпам.

Алімпійскі інтэрнацыяналізм, на які П'ер дэ Кубертэн ускладаў вялікія спадзяванні, не змог атрымаць перамогі ў барацьбе з нацыяналізмам. У рэшце рэшт нельга выкрасліць з памяці тыя часы, калі Гульні замест таго, каб паменшыць міжнародную напружанасць, распальвалі канфлікты і прыводзілі да небяспечнай эскалацыі паміж народамі, як гэта было падчас Алімпійскіх гульняў у Берліне, Маскве і Лос-Анжэлесе. Экехейрыя, ці святы мір, што браў свае пачаткі са старажытнагрэчаскай даўніны, па праўдзе так ніколі і не стаў дамінантай і прынцыпам кіравання Гульняў новага часу. Сумяшчальнасць сучасных ідэй з тымі, што былі сфармуляваныя старажытнымі грэкамі, адлюстроўваецца амаль выключна на дэкларатыўным узроўні. Галоўным носьбітам гэтых ідэй стаў П. дэ Кубертэн, але нават ён у канцы жыцця зразумеў, што сяброўства, мір, дабро і высакароднае спаборніцтва не здольныя стаць па-сапраўднаму важнейшымі прынцыпамі чалавечага грамадства. Алімпізм у новым фармаце быў дэкларатыўным, яго ідэйнае адзінства і асноўныя ісціны пад цяжарам сацыяльнай рэальнасці дэфарміраваліся.

Асабіста П'ер дэ Кубертэн звяртаў вялікую ўвагу на філасофскае асэнсаванне алімпізму. Але антычны сэнс, так глыбока ўкаранёны ў паняцце алімпійскай ідэі, зрабіў, быць можа, занадта моцны адбітак на яго трактоўку самога спартыўнага руху. Алімпіяда паўставала не толькі ў выглядзе непасрэдных спаборніцтваў, не толькі ў выглядзе свята спорту, але і як нешта іншае, больш значнае, больш каштоўнае. Гульні характарызаваліся як міжнародны фестываль моладзі, як свята вясны чалавецтва, дзе аб'ядноўваюцца ўсе формы фізічнай актыўнасці і ўсе народы свету. Маральны крытэрый дамінаваў у сутнасці спартыўных змаганняў, падкрэсліваў важнасць самакантролю, братэрства, узаемапаразумення і г. д. Усё разам гэта павінна было б спыніць гвалт і жорсткасць у спорце.

Трэба адзначыць, што творчы ўклад П. дэ Кубертэна ў станаўленне, развіццё, функцыянаванне і распаўсюджванне алімпізму знайшоў свой адбітак у далейшых сацыяльных працэсах. МАК нават усталяваў медаль П'ера дэ Кубертэна за праявы высакародства і вернасці духу «Fair play» падчас Алімпійскіх гульняў.

Алімпійская хартыя характарызуе алімпізм як філасофію жыцця, і спорт у гэтай інтэрпрэтацыі падаецца праз такія опцыі, як сацыяльная роўнасць у яе незалежнасці ад нацыянальнага паходжання, рэлігійнага веравызначэння, культуры, матэрыяльнага становішча. Усе яны звязваюцца паміж сабой праз правілы гульні. Спартыўныя спаборніцтвы ўлічваюць не толькі пе-

рамогу, але і сам працэс гульні, як сустрэчу людзей з усяго свету з мэтай змаганняў на стадыёне. Спартоўцы павінны быць шчырымі і сумленнымі, і ўдзел у спаборніцтвах дае ім магчымасць прадэманстраваць свае самыя лепшыя якасці. Алімпізм у такім выпадку паўстае як своеасаблівы крытэрый, як падстава, што дае магчымасць вызначыць атлета і яго атачэнне ў сістэме іерархіі духоўных каштоўнасцяў. Алімпійская клятва ў гэтым выпадку замацоўвае адносіны ўдзельніка спаборніцтваў не толькі да іншых суб’ектаў дзейнасці, але таксама і да самрга сябе [14, с. 36–37].

Адраджэнне алімпійскай ідэі і аднаўленне традыцыі правядзення Алімпійскіх гульняў у навейшай гісторыі сталася магчымым дзякуючы шматлікім асабістым талентам П. дэ Кубертэна. Яго інтэрпрэтацыя спадчыны культуры Старажытнай Грэцыі адносна феномену алімпізму спрыяла фарміраванню, развіццю, функцыянаванню і распаўсюджванню спорту па ўсім свеце і пакінула магчымасці для больш шырокай трактоўкі гэтай з’явы згодна са зменамі сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства на падставе тэндэнцыі глабалі-зацыі. Ідэі П’ера дэ Кубертэна апярэдзілі час. Яго рамантызм і сентыменталізм, што былі навеяны ідэалізацыяй старажытнагрэчаскай культуры і феноменам народжаных ёю гульняў, разыходзіліся з новымі сацыяльна-эканамічнымі і палітычнымі рэаліямі, якія базіраваліся на капіталістычнай аснове развіцця грамадства.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Olimpizm jest stanem ducha [Electronic resource]. – Mode of access: https://histmag.org/-Pierre-de-Coubertin-ojciec-nowozytnych-igrzysk-olimpijskich-6915. – Date of access: 01.02.2023.
2. Pierre de Coubertin [Electronic resource]. – Mode of access: https://timenote.info/en/Pierre-de-Coubertin. – Date of access: 02.02.2023.
3. Кубертен, де П. Ода спорту / П. де Кубертен // Олимпийский огонь. Спорт в творчестве поэтов мира : сборник / сост. В. П. Бурич. – М. : Физкультура и спорт, 1980. – С. 179–182.
4. Lipiec, J. Filozofia olimpizmu / J. Lipiec. – Warszawa : SPRINT, 1999. – 234 s.
5. Люкевич, В. Романтизм и сентиментализм Fair Play в прагматическом обществе / В. Люкевич // Олимпийское движение и социальные процессы : материалы конф. в рамках II Междунар. форума «Молодежь – Наука – Олимпизм», Москва, 15–18 июня 2002 г. – М. : Совет. спорт, 2002. – С. 128–131.
6. Люкевіч, У. Спартыўная этыка : навуч. дапам. для студэнтаў фак. фіз. выхавання / У. Люкевіч. – Брэст : [б. в.], 2007. – 120 с.
7. Люкевіч, У. Fair play: тэорыя і практыка / У. Люкевіч. – Берасьце : Выд-ва С. Лаўрова, 1998. – 188 с.
8. Coubertin, de P. Przemówienia. Pisma różne i listy. T. II / P. de Coubertin. – Warszawa : LEA Sp. z o.o., 1994. – 152 s.
9. Люкевіч, У. П. Гульні Старажытнай Элады / У. П. Люкевіч // Гульні і забавы ў культуры правядзення вольнага часу дзяцей і моладзі: традыцыі і навацыі : зб. навук. пр. – Брэст : Альтэрнатыва, 2014. – С. 3–7.
10. Hirthler, G. Celebrating Pierre de Coubertin: the French genius of sport who founded the modern Olympic Games [Electronic resource] / G. Hirthler. – Mode of access: https://olympics.com/-ioc/news/celebrating-pierre-de-coubertin-the-french-genius-of-sport-who-founded-the-modern-olym-pic-games. – Date of access: 02.02.2023.
11. Firek, W. Filozofia olimpizmu Pierre’a de Coubertina / W. Firek. – Warszawa : FALL, 2016. – 188 s.
12. Olympic Charter (in force as from 8 August 2021) / International Olympic Committee. – Lausanne : International Olympic Committee, 2021. – 112 p.
13. Kurkiewicz, A. Idea olimpizmu / A. Kurkiewicz // Infos. – 2008. – Nr 14 (38). – S. 1–4.
14. Deberny, K. Błyszczący sterowiec. Pierre de Coubertin o sporcie i olimpizmie / K. Deberny, K. Płoszaj, W. Firek. – Warszawa : Polski Komitet Olimpijski, 2016. – 132 s.

REFERENCES

1. Olimpizm jest stanem ducha [Electronic resource]. – Mode of access: https://histmag.org/-Pierre-de-Coubertin-ojciec-nowozytnych-igrzysk-olimpijskich-6915. – Date of access: 01.02.2023.
2. Pierre de Coubertin [Electronic resource]. – Mode of access: https://timenote.info/en/Pierre-de-Coubertin. – Date of access: 02.02.2023.
3. Kuberten, de P. Oda sportu / P. de Kuberten // Olimpijskij ogon'. Sport v tvorchiestvie poetov mira : sbornik / sost. V. P. Burich. – M. : Fizkul'tura i sport, 1980. – S. 179–182.
4. Lipiec, J. Filozofia olimpizmu / J. Lipiec. – Warszawa : SPRINT, 1999. – 234 s.
5. Liukievich, V. Romantizm i sientimientalizm Fair Play v pragmatichieskom obshchiestvie / V. Liukievich // Olimpijskoje dvizenije i socyal'nyje processy : matierialy konf. v ramkakh II Miezdunar. foruma «Molodiozh – Nauka – Olimpizm», Moskva, 15–18 ijunia 2002 g. – M. : Soviet. sport, 2002. – S. 128–131.
6. Liukievich, U. Spartyunaja etyka : navuch. dapam. dlia studentau fak. fiz. vykhavannia / U. Liukievich. – Brest : [b. v.], 2007. – 120 s.
7. Liukievich, U. Fair play: teoryja i praktyka / U. Liukievich. – Bierascie : Vyd-va S. Laurova, 1988. – 188 s.
8. Coubertin, de P. Przemówienia. Pisma różne i listy. T. II / P. de Coubertin. – Warszawa : LEA Sp. z o.o., 1994. – 152 s.
9. Liukievich, U. P. Hul'ni Starazytnaj Elady / U. P. Liukievich // Hul'ni i zabavy u kul'tury praviadziennia vol'naha casu dziaciej i moladzi: tradycyji i navacyji : zb. navuk. pr. – Brest : Al'ternatyva, 2014. – S. 3–7.
10. Hirthler, G. Celebrating Pierre de Coubertin: the French genius of sport who founded the modern Olympic Games [Electronic resource] / G. Hirthler. – Mode of access: https://olympics.-com/ioc/news/celebrating-pierre-de-coubertin-the-french-genius-of-sport-who-founded-the-modern-olympic-games. – Date of access: 02.02.2023.
11. Firek, W. Filozofia olimpizmu Pierre'a de Coubertina / W. Firek. – Warszawa : FALL, 2016. – 188 s.
12. Olympic Charter (in force as from 8 August 2021) / International Olympic Committee. – Lausanne : International Olympic Committee, 2021. – 112 p.
13. Kurkiewicz, A. Idea olimpizmu / A. Kurkiewicz // Infos. – 2008. – Nr 14 (38). – S. 1–4.
14. Deberny, K. Błyszczący sterowiec. Pierre de Coubertin o sporcie i olimpizmie / K. Deberny, K. Płoszaj, W. Firek. – Warszawa : Polski Komitet Olimpijski, 2016. – 132 s.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 20.03.2023*